

# СА СЛАЎНЫМ СВЯТАМ ПЕРАМОГІ!

*Заўтра ў 57-ы раз урачыста і шырокамаштабна будзе адзначацца самае знамянальнае для нас свята — Дзень Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. Яно стала магчымым у выніку велізарных страт. Дзеля разгрому гітлераўскіх захопнікаў аддадзены дзесяткі мільёнаў жыццяў. А насельніцтва нашай сінявокай Беларусі за гады мінулай вайны зменшылася амаль на трэць.*

*Ужо вельмі мала засталося тых, хто са зброяй у руках абараняў незалежнасць сваёй Айчыны, каваў Перамогу самаадданай працай, ад карычневай чумы, векавога рабства вызваляў многія народы Еўропы. Але памяць аб мужных сынах і дочках Радзімы, яе героях ніколі не згасне ў сэрцах удзячных нашчадкаў.*

**Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта горача віншуюць ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, былых партызанаў і падпольшчыкаў, усіх выкладчыкаў, супрацоўнікаў, студэнтаў і аспірантаў ГДУ імя Ф.Скарыны са святам Перамогі, жадаюць усім яснага мірнага неба, моцнага здароўя, дабрабыту ў жыцці!**




ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# ГОМЕЛЬСКІ УНІВЕРСІТЭТ



*№ 9 (1002)* | *АЎТОРАК, 8 мая 2001 г.* | *Газета заснавана ў верасні 1969 года* | *Выходзіць два разы ў месяц* | *Цана дагаворная*


## АБРАНЫ НА II УСЕБЕЛАРУСКІ НАРОДНЫ СХОД

Праз дзесяць дзён у Палацы Рэспублікі пачне сваю работу II Усебеларускі народны сход. Ён разгледзіць пытанні, ад вырашэння якіх у многім будзе залежыць далейшы лёс нашай краіны.

У гэтым гістарычным форуме прымуць удзел і 73 прадстаўнікі г.Гомеля, якія дэлегіраваны ад арганізацый, прадпрыемстваў і ўстаноў абласнога цэнтра на гарадскім сходзе ўпаўнаважаных.

На Усебеларускім народным сходзе наш універсітэт будзе прадстаўляць яго рэктар член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь прафесар М.В.Селькін.

## НА САВЕЦЕ УНІВЕРСІТЭТА

У апошнюю суботу красавіка адбылося чарговае ў бягучым навучальным годзе пасяджэнне Савета універсітэта. На яго пачатку ва ўрачыстай абстаноўцы рэктар член Савета Рэспублікі прафесар М.В.Селькін уручыў дыпломы дацэнта кандыдатам навук А.М.Воінавай — з кафедры беларускай мовы, В.В.Кавальчук і В.А.Мінчанка — з кафедры бухуліку, кантролю і АГД, а С.У.Шарэнду з кафедры АЛФК — дыплом кандыдата педагагічных навук. Міхаіл Васільевіч уручыў таксама ўзнагароды Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь: Ганаровыя граматы — загадчыку кафедры беларускай літаратуры прафесару І.Ф. Штэйнеру і дацэнту кафедры матэматычнага аналізу А.У. Гаўрылюку; Граматы — прафесару кафедры оптыкі С.М.Курылкінай, дацэнтам В.А.Мядзведзеву з кафедры фізічнага выхавання і спорту, загадчыку кафедры вышэйшай матэматыкі У.М.Семенчуку, А.А.Ружыцкай з кафедры вылічальнай матэматыкі і праграміравання, загадчыку кафедры геалогіі і разведкі карысных выкапняў А.Ю.Трацэўскай, рэдактару газеты "Гомельскі універсітэт" У.П.Балогу.

Аб арганізацыі харчавання студэнтаў у сталовай і буфетах універсітэта Савету далажыла дырэктар прадпрыемства грамадскага харчавання Т.М. Соціева.

Савет зацвердзіў рашэнне конкурснай камісіі па правядзенню Скарынаўскіх чытанняў, якія адбудуцца на пасяджэнні Савета ГДУ ў канцы бягучага месяца. Іх лаўрэатамі прызнаны загадчык кафедры грамадзянска-прававых дысцыплін юрыдычнага факультэта С.Г. Шулейка, дацэнт кафедры фізічнага выхавання і спорту В.А. Мядзведзеў, дацэнт В.К. Шынкарэнка — з кафедры беларускай літаратуры, дацэнт кафедры тэорыі і методыкі фізічнага выхавання Б.А.Царыкаў.

Па інфармацыі дэкана завочнага факультэта М.Н.Мурашкі адкрыты спецыялізацыі: "Рацыянальнае прыродакарыстанне і ахова прыроды" на спецыяльнасці "Геаграфія", "Улік, аналіз і аўдыт у банках", "Улік, аналіз, аўдыт знешнеэканамічнай дзейнасці" на спецыяльнасці "Бухгалтарскі ўлік, аналіз і аўдыт" завочнага факультэта.

На пасяджэнні Савета былі разгледжаны і прыняты адпаведныя рашэнні па некаторых іншых пытаннях універсітэцкага жыцця.

## ПЕРШАМАЙ НОВАГА СТАГОДДЗЯ

Выключна цёплым і сонечным выдаўся сёлета першамайскі дзень. Гэта значна ўзняло настрой гамяльчан. Многія з іх прынялі ўдзел у святочнай дэманстрацыі. У агульнай калоне Цэнтральнага раёна былі прадстаўнікі адміністрацыі, дэканы і загадчыкі кафедр, выкладчыкі, супрацоўнікі, студэнты і аспіранты нашага універсітэта. Пад гукі духавых аркестраў яны прайшлі па Савецкай вуліцы да цэнтральнай плошчы горада, дзе адбыўся святочны мітынг. Тут, а таксама ў іншых мясцінах абласнога цэнтра прайшлі ўрачыстасці ў гонар вясны і працы, барацьбы за ўмацаванне і захаванне міру на нашай планеце.

## УРУЧАНЫ ДЫПЛОМЫ ПРЭЗІДЭНЦКАГА ФОНДУ

У апошняй дэкадзе красавіка г.г. споўнілася 5 гадоў з дня стварэння Савета спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адароных навучэнцаў і студэнтаў. За прайшоўшы час з гэтага фонду атрымалі матэрыяльную дапамогу многія сотні чалавек, творчых калектываў і іх кіраўнікоў. Сярод іх — пяцікурснік фізічнага факультэта Аляксандр Купо, кандыдат біялагічных навук, дацэнт, загадчык кафедры экалогіі А.М.Кусянкоў, студэнцкая навукова-даследчая лабараторыя "Электроніка" (кіраўнік — ст. выкладчык кафедры агульнай фізікі І.М. Якаўцаў) з нашага універсітэта. Акрамя прэмій яны ўдастоены адпаведных Дыпломаў. Ва ўрачыстай абстаноўцы на пасяджэнні Савета універсітэта іх уручыла ўзнагароджаным вядучы эксперт Галоўнага ўпраўлення аналітычнай і прававой работы Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, сакратар Савета спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адароных навучэнцаў і студэнтаў М.У.Пташнік, якая таксама падрабязна расказала аб плённай дзейнасці гэтага Савета.



Дыплом уручаецца І.М. Якаўцаву. Фота У. ЧЫСЦІКА.

## АДКРЫЕЦЦА УНІВЕРСІТЭТ ІНТЭГРАЦЫІ

У г.Санкт-Пецярбургу адбылося двухдзённае пасяджэнне кіраўнікоў расійскіх і беларускіх ВНУ, якія з'яўляюцца саўдзельнікамі стварэння навукова-адукацыйнага цэнтра "Універсітэт інтэграцыі". Яго запланавана адкрыць у Магілёве. У распрацоўцы праекта па адкрыццю ВНУ новага тыпу актыўны ўдзел прынялі рэктар нашага універсітэта член Савета Рэспублікі, прафесар М.В. Селькін і прарэктар па вучэбнай рабоце прафесар С.Ф.Каморнікаў.

## ПАПАЎНЕННЕ АКАДЭМІІ

У красавіку Гомельскае аддзяленне Беларускай інжынернай тэхналагічнай акадэміі папоўнілася новымі членамі-карэспандэнтамі і акадэмікамі. Сярод тых, каму ва ўрачыстай абстаноўцы на агульным сходзе ў рэгіянальнай "штаб-кватэры" — Інстытуце механікі металапалімерных сістэм імя У.А.Белага Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі кіраўнік аддзялення, акадэмік БІТА, прафесар, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь Б.І.Купчынаў уручыў дыпломы акадэміка, быў прарэктар нашага універсітэта па навуковай рабоце, доктар тэхнічных навук, прафесар Д.Р.Лін.

На сходзе абласнога аддзялення БІТА абмеркаваны праблемы, якія патрабуюць аб'яднання намаганняў для іх неадкладнага вырашэння па развіццю Гомельшчыны праз навукова-тэхнічныя рэгіянальныя праграмы і гаспадарчыя дагаворы. У гэтых адносінах свае меркаванні выказаў і член тэхнічнага савета пры Гомельскім аблвыканкаме прафесар Д.Р.Лін.

**Міжнародныя канферэнцыі**

## ДЛЯ РАЗВІЦЦЯ СУЧАСНАГА МОВАЗНАЎСТВА



У нашым універсітэце адбыліся V Міжнародныя навуковыя чытанні, прысвечаныя памяці славутага мовазнаўцы з Гомельшчыны Сцяпана Некрашэвіча. Арганізатарам навуковай канферэнцыі стала кафедра беларускай мовы. Сёлетні навуковы форум (а чытанні праводзіліся ўжо ў пяты раз) стаў карысным для ўсіх навукоўцаў-філолагаў, бо асноўныя пытанні, якія абмяркоўвалі тут, тычыліся актуальных праблем сучаснага мовазнаўства, гісторыі славянскіх моў, дыялекталогіі, а таксама надзённых праблем сучаснага літаратуразнаўства. Усяго ў канферэнцыі прынялі ўдзел 120 навукоўцаў з Беларусі, Украіны, Польшчы.

Адкрыў V Міжнародныя навуковыя чытанні, прысвечаныя Сцяпану Некрашэвічу, прарэктар па навуковай рабоце доктар тэхнічных навук, прафесар Д.Р.Лін. Ён павіншаваў удзельнікаў канферэнцыі з адкрыццём навуковых чытанняў, пажадаў канферэнцыі плённай работы, а ўдзельнікам — поспехаў у навуковай дзейнасці, а таксама выказаў упэўненасць, што гэтыя чытанні будуць пастаянным месцам сустрэчы навукоўцаў-філолагаў. Віншаванні навукоўцам выказаў і дэкан філалагічнага факультэта дацэнт У.А.Бобрык. Ён паведаміў гасцям канферэнцыі цікавыя звесткі з гісторыі нашага універсітэта і жыцця філалагічнага факультэта.

Пленарнае пасяджэнне распачаў наш госць з Варшаўскага універсітэта Аляксандр Баршчэўскі, які выступіў з дакладам "Карціна дарог на беларускім Палессі ў навукова-папулярнай публіцыстыцы этнографа Г.Пяткевіча". Яшчэ адзін наш госць з Польшчы Багуслаў Зялінскі паведаміў удзельнікам канферэнцыі аб сучасных метадах рэканструкцыі беларускага гістарычнага і літаратурнага працэсу. Цікавым стаў і даклад члена-карэспандэнта НАН Беларусі, доктара філалагічных навук, прафесара А.М.Булыкі "Літуанізмы ў слоўнікавым саставе старабеларускай літаратурна-пісьмовай мовы". Доктар філалагічных навук, прафесар Р.М.Казлова, працягнуўшы пачатую А.М.Булыкам тэму гісторыі беларускай мовы і яе ўзаемадзеяння з іншымі славянскімі і неславянскімі мовамі, зрабіла даклад "Праславянскі фонд у гідраніміі Палесся".

На канферэнцыі вялі работу 8 навуковых секцый. Добрым знакам гэтых чытанняў стаў удзел у іх, акрамя сталых навукоўцаў, шматлікіх аспірантаў і студэнтаў-філолагаў. Гэта з'яўляецца сведчаннем таго, што ў беларускай філалогіі ёсць будучыня.

**К.ХАЗАНАВА,**
**асістэнт кафедры беларускай мовы.**

## З УЗНАГАРОДАЙ!

*За шматгадовую плённую вучэбную і выхаваўчую работу па падрыхтоўцы маладых спецыялістаў, вялікі ўклад у навукова-даследчую работу, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці Ганаровай граматай універсітэта ўзнагароджаны дацэнт кафедры філасофіі Фяськоў Аляксей Андрэевіч.*

## Беларусь на карце свету МІКАЛАЙ КАРЖАНЕЎСКІ




У Сярэдняй Азіі тры ледавікі (у Заалайскім хрыбце, хрыбце Какшаалтау і Заілійскім Алатау), а таксама вяршыня ў Заалайскім хрыбце носяць імя беларускага географа Мікалая Леапольдавіча Каржанеўскага.

Прафесар, доктар геаграфічных навук М.Л.Каржанеўскі нарадзіўся ў 1879 годзе ў сяле Завярэж'е Невельскага павета Віцебскай губерні. У савецкі час асноўныя даследаванні праводзіліся па фізічнай геаграфіі Азіі, асабліва ў галіне гляцыялогіі. Склаў каталог ледавікоў Сярэдняй Азіі, адкрыў і вывучыў каля 70 вялікіх ледавікоў і шэраг горных вяршынь.

Ледавік Каржанеўскага на паўночнай мяжы Паміра — у Заалайскім хрыбце — размешчаны на ўсход ад піка Леніна, даўжыня яго 19,5 км, адкрыты ў 1928 годзе. Назва прысвоена Усесаюзным Геаграфічным таварыствам па прапанове Таджыка-Памірскай экспедыцыі. У працах па даследаванню горных масіваў Сярэдняй Азіі географу актыўна дапамагала яго жонка Яўгенія Каржанеўская. У гонар яе названа адна з найбольш высокіх горных вяршынь хрыбта Акадэміі навук у Таджыкістане. Пік Каржанеўскай размешчаны ў вярхоўі ледавіка Мушкетава (басейн ракі Муксу), вышыня піка 7105 м.

**Аляксандр САКАЛОЎ, студэнт гр. ЭК-11 геолага-геаграфічнага факультэта.**

**На здымку: паштовая марка з відарысам піка Я.Каржанеўскай, выпушчаная ў СССР у 1986 г.**

## Окно ПОчти студентов ДАДИМ ДОРОГУ ТАЛАНТАМ



Нераскрытый талант — это как бриллиант, томящийся в оковах шлака, ждущий старателя, который отыщет эту драгоценную слезу природы среди многочисленных и разнообразных пород полезных ископаемых. Найдет, очистит от примесей, отшлифует и подберет достойную оправу. Как часто мы даже не подозреваем в себе способностей к тому или иному виду творчества, но приходит старатель и дает жизненный шанс "зарытому таланту".

Есть и скрытые таланты. Их обладатели — люди, занимающиеся творчеством "для себя". Они пишут "в стол", не придавая своим "художествам" особого значения, считая свое творчество хобби, отдушиной в дисгармоничной повседневности.

Никогда бы не подумала, что простое задание для слушателей подготовительного отделения составить предложения (или короткий связный текст — рассказ, анекдот, юмореску, очерк, зарисовку) из слов диктанта, написанного на практическом занятии, обобщающем тему "Орфография", принесет столь неожиданный результат: 11 литературно-художественных миниатюр! Честно говоря, я просто растерялась — слишком большой выбор тем и сюжетов. И ни одного повтора! Только знакомые слова диктанта варьируются, и, пересыпаясь, как в калейдоскопе, создают все новые и новые картинки.

Рассказ Светы Поповой о персидском голубого окраса котенке по кличке Буревестник, озорном проказнике и мастере кусать и царапать все что ни попадя под аккомпанемент симфонии Вагнера сменяется повествованием Даши Корховой, которая описывает одну из своих поездок в фирменном поезде "Буревестник". Путевые заметки Даши невелики по объему, но густо насыщены орфограммами, написаны в строгом учебно-деловом стиле. Вика Балцевич в рассказе "Подстаканник" в сдержанной форме поведала о том, как этот предмет столовой утвари неожиданно изменил судьбу ее героини, послужив предлогом к бракосочетанию. Слушательница под загадочным псевдонимом Ромашка описала "Последние минуты" жизни девушки, застреленной из парабеллума ревнивой женой профессора, соблазнившего и накачавшего наркотиками это юное создание. Два варианта приключений на отдыхе в санатории представили Оля Барботкина и Инна Наумова. А Максим Хомец вынес "Безапелляционный приговор Америке".

Неизвестно, как сложатся творческие судьбы моих слушателей, но если на их жизненном пути не встретятся менторы от искусства, если не погасят огонек творческой мысли окрики ремесленников, если... Много может быть этих "если", но каждый человек сам творец своей судьбы. Дадим же дорогу талантам, поддержим их.

**Т.АВДОНИНА, доцент кафедры довузовской подготовки и профориентации.**

## Мир цветов — мир прекрасного АНЮТИНЫ ГЛАЗКИ



Так называют садовую гибридную форму фиалки, выведенной на основе фиалки трехцветной и фиалки Витрокка.

Многочисленные сорта анютиных глазок украшают клумбы, рабатки, альпийские горки, контейнеры, балконные ящики. Особенно ценится их весеннее цветение. Высаженные в цветущем состоянии рано весной, они мгновенно оживляют клумбы, создают яркие привлекательные цветовые пятна. И это не удивительно. Вряд ли они могут сравниться с другими цветами по многообразию цвета и рисунка. Окраска их лепестков охватывает всю цветовую гамму от винно-красного, небесно-голубого до почти черного цвета. Поверхность лепестков бывает бархатистой, атласной. Кроме того, есть лепестки с гофрированным краем, с полосками другого тона. Особенным изяществом и декоративностью отличаются орхидеецветковые фиалки светлых тонов. Размеры цветков достигают 10 см в диаметре.

По немецкой легенде самый крупный и нарядный нижний трехцветный лепесток, опирающийся на 2 чашелистика — "стульчика" — это расфранченная мачеха. По обеим от нее сторонам сидят каждая на отдельном стульчике ее родные дочери в двухцветных платьях. А два лепестка сверху — более скромные, бледные, одноцветные, еле умещаются на одном стульчике — это падчерицы. Чтобы их утешить, добрый волшебник прицепил мачехе хвост, а ее дочерям — усы. На самом деле "хвост" — это шпорец, вырост, где накапливается нектар, а усы — это указатели к нему опылителям.

Цветок анютиных глазок напоминает личико с глазками. И в зависимости от настроения человека оно может выражать любопытство, грусть, удивление, лукавство. Этот эффект усиливается, если цветки находятся на уровне глаз — в горшке, в низкой вазе. Цветет каждый цветок 6-8 дней, столько же стоит в срезке.

Чтобы добиться цветения рано весной, семена анютиных глазок высевают в июне-июле предшествующего года. В конце августа их высаживают на постоянное место, к зиме слегка укрывают. Если семена высеять в теплице в марте, — они зацветут в этот же год в конце лета. Чтобы они долго цвели, нужно вовремя убирать отцвевшие цветки.

В средние века цветами трехцветных фиалок обрамляли портреты любимых людей. Французы называли их "цветами на память", англичане — "сердечной радостью". В Польше невеста дарила анютины глазки жениху в знак верности. Фиалка была эмблемой приверженцев Наполеона I. Ее цветы вдохновляли поэтов и композиторов разных времен и стран. И в настоящее время эти хрупкие и нежные цветы одни из самых популярных в мае — они открывают сезон массового цветения пробудившейся природы.

**Р.МАРКЕЛОВА, доцент кафедры ботаники и физиологии растений.**

## ФІНАЛ АБЛАСНОГА КРОСУ

У Мазыры прайшоў фінал абласнога легкаатлетычнага кросу, які з'яўляўся адборачным да фіналу рэспубліканскага кросу.

У камандным заліку прызавая тройка такая: Мазыр, Светлагорск і Жлобін.

Прыемна адзначыць, што ў групе юніёрак на дыстанцыі 3000 м перамагла студэнтка факультэта фізічнай культуры Стэла Ярчак.

Да сказанага трэба дадаць, што гэта адзіная перамога красменаў абласнога цэнтра.

**В.МАРЧАНКА.**

## На маю думку ЦІ ТРЭБА НАВУЧАЦЬ ШКОЛЬНІКАЎ ПРАВУ?

***Прэстыж прафесіі юрыста высокі і даўгалетні. Паўсюдна вітаецца прававая асвета. Права вывучаецца ў школе як адзін са складнікаў прадмета "Чалавек і грамадства". Тэндэнцыя такая, што права хочуць увесці як асобную, паўнапраўную, абавязковую дысцыпліну ў рамках школьнай праграмы. Я зусім не хачу, ды і не магу прынізіць ролю права, важнасць ведання законаў кожным грамадзянінам ці жыхаром Рэспублікі Беларусь. Але хочацца падысці да гэтага пытання з пункту гледжання мэтазгоднасці.***

Узрост школьнікаў, якім давядзецца вывучаць права, не старэйшы за 17 гадоў. Катэгорыі права, структура законаў — гэта ўсё вельмі складаныя паняцці. Ці патрэбны яны школьнікам? Увогуле "так", бо права — важнейшая частка нашага жыцця, курс будзе садзейнічаць фарміраванню светапогляду, маралі. Але гэтыя задачы выконваюць і іншыя прадметы: гісторыя, літаратура, "Правы чалавека" і інш. Ці варта нагружаць вучняў, яшчэ дзяцей, лішнім прадметам? Яны ж і так перагружаны, вывучаюць шмат прадметаў, матэрыял якіх засвойваюць часта не больш чым на 20-30 працэнтаў. Права сапраўды захоплівае. Кожны пятышосты школьнік, калі не больш, марыць стаць юрыстам. Але будучыя юрысты вывучаюць права гадамі, прычым у іх праграмах прававыя дысцыпліны займаюць 80-90 працэнтаў. У школьнікаў жа права будзе складаць 2-3 працэнты ад агульнай колькасці дысцыплін. Каб дыпламаваны юрыст мог працаваць адвакатам, суддзёй, патрабуецца стаж работы па спецыяльнасці ад двух да пяці гадоў. Гэта значыць, юрыстам становяцца праз 7-9 гадоў.

Вывучыўшы права ў школе, нават пры выдатным выкладанні, юрыстам не станеш. Я гэта ведаю з вопыту работы юрысконсультам, настаўнікам у школе, выкладчыкам на аддзяленні "правазнаўства" ў тэхнікуме і, нарэшце, ва універсітэце. Я не супраць інфармаванасці школьнікаў у пытаннях права. Няхай вывучаюць яго ў рамках факультатыўных дысцыплін, нядзельных школ і г.д. (размова, безумоўна, не ідзе пра спецшколы з юрыдычным ухілам).

Адна з задач школы — рыхтаваць дзяцей да жыцця. Вось выкананню гэтай задачы і павінен спрыяць "лекторый азбукі права". На мой погляд, вучні павінны быць азнаёмлены (без атрымання адзнак і залікаў) з такімі палажэннямі прававых нормаў, якія спатрэбяцца ім пасля заканчэння школы. А менавіта: што рабіць, калі згублены школьны атэстат; як быць, калі адмовілі ў прыёме дакументаў у ВНУ; як абскардзіць вынікі экзаменаў; якія правы і абавязкі ў школьнікаў і студэнтаў; як паводзіць сябе пры прыёме на работу; што рабіць, калі застаўся без бацькоў; як дапамагчы таварышу, калі яго бацькі не выконваюць бацькоўскіх абавязкаў; якія правілы супольнага жыцця, выплаты падаткаў, плацяжоў трэба захоўваць; як аформіць пашпарт, выезд за мяжу; навошта рэгістравацца ў ЗАГСе і рэгістраваць дакументы ў натарыуса; як адкрыць рахунак у банку і абараніць свае аўтарскія правы; як аформіць спадчыну. Пералік можа быць працягнуты, але гэта ўсё ж такі тое, з чым можа сутыкнуцца школьнік і што яму можа рэальна спатрэбіцца на гэтым адрэзку жыццёвага шляху. У форме гутаркі вышэйназванае і трэба даваць вучням. Напрыклад, пра атэстат гутарку можа правесці дырэктар ці завуч школы, нейкія звесткі школьнікам раскажуць работнікі аддзела апекі, начальнік пашпартнага стала і інш.

Праводзіць гутаркі належыць у 8-9 класах, бо старшакласнікам ужо не да гэтага, яны рыхтуюцца паступаць у ВНУ, тэхнікумы, шукаюць работу. Абмежаваная дзеяздольнасць, як вядома, наступае ў 14 гадоў. Гэта самы аптымальны ўзрост для вывучэння "азбукі права". Самі гутаркі могуць суправаджацца выхадам на месца (напрыклад, у ЗАГС, органы падатковай інспекцыі), праглядам вучэбных кінафільмаў.

Плюсам дадзенага варыянта з'яўляецца тое, што перападрыхтоўка настаўнікаў для гэтага не патрабуецца. Акрамя таго, трэба адрадзіць традыцыі супрацоўніцтва школы і структур, якія звязаны з выхаваннем дзяцей, далучаць да работы з вучнямі выкладчыкаў ВНУ, якія навучаюць праву. Усе пытанні каардынацыі павінны быць урэгуляваны мясцовымі органамі кіравання.

"Мы цалкам згодныя.., што не з кур'ёзамі і цудамі навукі, — пісаў К.Д.Ушынскі, — павінна ў школе знаёміцца дзіця, а, наадварот, прывучыць яго знаходзіць цікавае ў тым, што яго няспынна і паўсюль акаляе і тым самым паказваць яму на практыцы сувязь паміж навукай і жыццём".

Тады, можа, пакінем права юрыстам, а школьнікам дадзім тое, што давалі з пакалення ў пакаленне, у тым ліку "Злачынства і пакаранне" Ф.М.Дастаеўскага, сусветную гісторыю і гісторыю Рэспублікі Беларусь, а таксама ненавязлівыя "азы права"?

**Сяргей ЖАГОРАЎ, старшы выкладчык кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права.**

**("Настаўніцкая газета", №24 за 2001 г.).**

### ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖУНІВЕРСІТЭТ ІМЯ Ф. СКАРЫНЫ

аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантнай пасады дацэнта па кафедры тэорыі і методыкі фізічнага выхавання.

Тэрмін падачы заяў — не пазней 1 месяца з дня апублікавання паведамлення.

Заявы накіроўваць на адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104.

**РЭКТАРАТ.**

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат, выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты эканамічнага факультэта выказваюць глыбокае спачуванне намесніку дэкана эканомфака **Багданаву Міхаілу Іванавічу** з выпадку напаткаўшага яго гора — смерці **БАЦЬКІ.**

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, калектыў кафедры лёгкай атлетыкі і лыжнага спорту выказваюць глыбокае спачуванне дацэнту **Міхаленю Валерыю Маркавічу** з выпадку напаткаўшага яго гора — смерці **МАЦІ.**

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытай публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

ЗАСНАВАЛЬНІК -- Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Песіна, 80, пакой 2-14. Тэл. 56-30-71.

Зарэгістравана ў Дзяржкамдруку 26 чэрвеня 1996г. Рэгістрацыйны № 263

Спонсар газеты -- прафком студэнтаў.

Газета набрана и сверстана на настольно-издательском комплексе ИВЦ ГГУ, отпечатана на Республиканском полиграфическом унитарном предприятии "Полеспечать", г.Гомель, ул. Советская, 1.

Якасць друку адпавядае якасці арыгіналаў заказчыка.

Рэдактар Уладзімір БАЛОГА

Аб'ём 1 друк. арк.
Тыраж 1.000 экз.
Заказ 262
Падпісана да друку 7.05.2001 г.